# АДМЕТНЫ ЗНАЎЦА РЭЦЭПТАЎ ЖЫЦЦЯ

Многа добрых слоў ужо было сказана і яшчэ будзе гаварыцца ў гонар гэтага светлага чалавека. Дазвольце і мне запоўніць чарговую старонку памяці аб ім.

Хоць я ведала Сяргея Паўлавіча не так ужо і даўно, але яго незвычайнае абаянне, чалавечнасць, веліч, іскрыстасць, шчырая ўвага і павага да людзей, якія яго акружалі, пакінулі ў маёй душы гарачы след.

Калі адчыняліся дзверы Цэнтра і ўваходзіў Сяргей Паўлавіч, разам з ім у пакой заплывалі вясёлыя прыказкі, анекдоты, жыццёвыя гісторыі, што, безумоўна, спрыяла стварэнню і падтрыманню добрага настрою.

Ён часта наведваў наш Цэнтр і, калі прыходзіў, мы жартавалі, што госці павінны адчыняць дзверы нагамі, бо рукі павінны быць занятыя ўсялякімі прысмакамі. Жартавалі, жартавалі і дажартаваліся. Аднаго дня чуем грукат

у дзверы. Пайшлі паглядзець, што робіцца. А там… Сяргей Паўлавіч, у якога рук на дзверы ўжо не хапіла… Нават фотаздымак зрабілі на памяць аб гэтым. Дык і што далёка хадзіць... Многія жанчыны нашай бібліятэкі прайшлі ў яго курс, як правільна складаць пакеты з крамы. Некаторыя ўжо і не працуюць ва ўніверсітэце, а пакеты складаюць па-кубекаўску.

Немагчыма забыць і смак сала кубекаўскай засолкі, а гурочкі, а квашаную капустку. Толькі паслухаўшы аповеды пра гэтыя стравы, можна было наесціся. А што ўжо казаць, якая асалода паспытаць іх у рэальнасці. А знакамітая "Клюкаўка", рэцэпт якой Сяргей Паўлавіч даў і мне. Але тут ёсць яшчэ і перадгісторыя. Бо пра "Клюкаўку" гаварылася многа і доўга. Аж дух займала ад прадчування. Гаварылася і гаварылася… Гады два ці нават болей чакалі мы гэты рэцэпт, урэшце рэшт дачакаліся. І што ж вы думаеце, нягледзячы на мае стараннi і бездакорнае выкананне рэцэптурных патрабаванняў, кубекаўская "Клюкаўка" ўсё ж была значна лепшая. Не хапіла, мабыць, маёй "Клюкаўцы" яго незвычайнай энергетыкі…

З гумарам ён падыходзіў да любой справы, за якую браўся. Кубекаўская рэакцыя на заўвагі да яго "Ну, уваліў, як маманту" стала нашым любімым выказваннем, і гэта часта падымала нам настрой у складаных сітуацыях. А безліч анекдотаў на любую тэму. Некалькімі словамі ён мог падбадзёрыць, падтрымаць, развесяліць чалавека.

Часам ў нашым Цэнтры праводзяцца заняткі. І, вядома, што заняткі Сяргея Паўлавіча былі нашымі любімымі. На некаторы час мы маглі нават забыць пра свае справы, бо назіраць, як ён узаемадзейнічае са студэнтамі, было надзвычай цікава. Напружаная праца па тэме нярэдка перапынялася на некалькі хвілін вясёлым жартам ці анекдотам. На тварах студэнтаў узнікалі светлыя ўсмешкі, з'яўляліся сілы працаваць далей, нават калі гэта была трэцяя ці чацвёртая пара.

Прыгадаем таксама, з якой павагай Сяргей Паўлавіч ставіўся да жанчын, дзяўчат… З цёплым, нейкім добрым гумарам ён мог падыйсці як да студэнткі, так і да выкладчыцы, прыбіральшчыцы… Як сказалі б раней: "Гжэчны кавалер!". Аднак у той жа час і добры сем'янін, які з цеплынёй, любоўю і павагай згадваў пра сваю жонку, якая рана пайшла з жыцця і назаўсёды засталася для яго адзінай… Многа цёплых слоў ад яго мы чулі таксама і пра маці, і пра сястру…

Такі вось наш Сяргей Паўлавіч – жартаўнік з народнай кемлівасцю, з хітрынкай у вачах. Добры гаспадар, які не дзяліў заняткі на мужчынскія і жаночыя. Ён з радасцю ішоў па жыцці і нават у складаных будзённых сітуацыях заставаўся верным сабе – пазітыўным, жыццялюбным чалавекам. Яго жыццёвыя рэцэпты дапамагаюць жыць, а, бывае, што і выжываць у наш складаны час.

*А. П. Заяц*